# РАСПРАЦОЎКА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ «МАСТАЦТВА ПРАКТЫЧНАГА ЧАЛАВЕКАЗНАЎСТВА» (IX клас)

**_Т. І. Раўтовіч_**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Грэская сярэдняя школа»,*
*Рэспубліка Беларусь*

***Анатацыя.*** Факультатыўны занятак па тэме «Прыгажосць душы» праводзіцца ў форме «Круглага стала» з выкарыстаннем наглядных матэрыялаў. 9 клас – гэта ўзрост падлеткавага максімалізму, фізіялагічных змен у знешнасці. Вучні ў гэтым узросце ставяцца крытычна не толькі да сваіх аднакласнікаў, але і да сябе. Мэта заняткаў – раскрыць тэму сапраўднай прыгажосці.

**Тэма:** Прыгажосць душы.

**Задачы**: даць уяўленне аб разнастайнасці формаў праяўлення прыгажосці чалавека; паказаць ролю мастацтва ў раскрыцці выдатных бакоў асобы; развіваць эстэтычнае ўспрыманне, удумлівае і ўважлівае стаўленне да акружаючых людзей.

Ход падрыхтоўкі занятка

1. Падбор рэпрадукцый карцін на тэму «Прыгажосць чалавека» («Сіксцінская мадонна» Рафаэля; «Партрэт бабулькі» Рэмбранта; «Партрэт акадэміка, фізіёлага І. П. Паўлава» М. В. Несцерава; «Горкі» П. Д. Корын; «Акторка П. А. Стрэпетава», «Партрэт М. П. Мусаргскага» І. Я. Рэпіна; «Партрэт Л. М. Талстога» М. М. Ге і І. М. Крамскога; «Партрэт Ф. М . Дастаеўскага» В. Г. Пярова; «Гаспадар зямлі», «Зацвіў багугульнік», партрэты лётчыкаў-касманаўтаў А. М. Шылава і інш.).
2. Стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі «Прыгажосць чалавека».
3. Падбор выказванняў па тэме занятка.
4. Падрыхтоўка вучнямі невялікіх паведамленняў аб сустрэчах з цікавымі людзьмі.

План-канспект занятка

1. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Уступнае слова настаўніка (тэзісы):

У жыцці знешняя прыгажосць не заўсёды супадае з выдатнымі чалавечымі якасцямі. «Прыгажосць, грацыя, знешнасць, прыемны голас палягчаюць жыццёвы шлях, – пісаў вядомы польскі педагог Януш Корчак. – Але не трэба пераацэньваць прыгажосць: не падмацаваная іншымі добрымі якасцямі, яна можа прынесці шкоду».

Знешне непрыкметны чалавек можа захапляць нас сваёй мужнасцю, дабрынёй, сумленнасцю, здольнасцю да самаахвяравання дзеля вялікай ідэі. Верш *Сергея Арлова «*Вот человек – он искалечен…» (Дадатак 1. (падрыхтаваны вучань чытае верш)).

Работа вучняў з тлумачальным слоўнікам: Знайсці значэнне слова прыгажосць.

Слова настаўніка. Як навучыцца бачыць усю разнастайнасць прыгажосці чалавека, як распазнаць крывадушша, душэўную чэрствасць, эгаізм, якія хаваюцца часам за знешняй прыгожай абалонкай? У гэтым дапаможа нам мастацтва. В.Г. Бялінскі, падкрэсліваючы вялікую сілу мастацтва, пісаў: «Асоба, нічым не выдатная сама па сабе, атрымлівае праз мастацтва агульнае значэнне, для ўсіх роўна цікавае, і на чалавека, які пры жыцці не звяртаў на сябе ўвагу, глядзяць стагоддзі з міласці мастака, які даў яму сваім пэндзлем новае жыццё!»

**2. Асноўны этап.**

*Работа ў групах.* Настаўнік прапануе навучэнцам выканаць шэраг заданняў.

Заданне 1. (на слайдах дэманструюцца выявы статуі Давіда працы Мікеланджэла, Венеры Мілоскай, скульптурны партрэт егіпецкай царыцы Неферціці і партрэты пажылых людзей на карцінах Рэмбранта, П.Дз. Корын, А.М. Шылава і інш.) У чым непадобнасць партрэтаў? На чым акцэнтуюць увагу мастакі ў сваіх творах? Што аб'ядноўвае ўсе партрэты? У чым прыгажосць адлюстраваных мастаком асоб? Давайце паразважаем разам.

Прыкладнае тлумачэнне настаўніка. Прыгажосць статуі Давіда і Венеры Мілоскай больш даступная для ўспрымання. Мастакі звяртаюць увагу на знешнюю, фізічную прыгажосць чалавека, кідкую і яркую, падкрэсліваюць сілу і мужнасць у юнака і жаноцкасць, грацыёзнасць, гармонію формаў ў жанчыны. Партрэты пажылых людзей, на першы погляд, не выклікаюць захаплення ў людзей, не падрыхтаваных да ўспрымання мастацтва. Аднак ўглядзьцеся ў гэтыя партрэты! Маршчыністыя твары, састарэлыя, сухія рукі... Але твары гэтых людзей прыгожыя сваёй адухоўленасцю, мудрасцю, унутраным свячэннем.

Заданне 2. (на слайдзе дэманструецца партрэт Ф. М. Дастаеўскага работа В. Г. Пярова, партрэт акадэміка І. П. Паўлава працы М. В. Несцерава) Якія рысы характару ў партрэтуемых вас прыцягнулі? Якую якасць асобы жадае падкрэсліць мастак? Чым ён хоча нас зацікавіць? На што звярнуць увагу? Як сам мастак ставіцца да партрэтуемых? Якімі мастацкімі сродкамі ён падкрэслівае адметнасць чалавека, яго характэрныя рысы? (Выказванні вучняў)

Слова настаўніка: Успамінаючы пра сваю працу над партрэтам савецкага фізіёлага, акадэміка І. П. Паўлава, мастак М. В. Несцераў пісаў, што ён доўга не адважваўся пісаць пратрэт акадэміка, таму што нічога запамінальнага і незвычайнага ў яго абліччы на было. Аднак пасля сустрэчы з Паўлавым мастак быў моцна ўражаны асобай гэтага незвычайнага чалавека: «Цэлы віхор слоў, жэстаў панёсся, апярэджваючы адзін аднаго ... больш яркай асобы я і ўявіць сабе не мог, – пісаў мастак. – Ён быў дашчэнту самабытны, непасрэдны. Я забыў пра тое, што я не партрэтыст, ў ва мне ... прачнуўся творца, заглушыўшы ўсё, засталася толькі неспатольная смага напісаць гэтага дзівоснага старога чалавека...».

Расказ вучняў з пра іх сустрэчы з цікавымі людзьмі. *Чаму яны падаліся вам цікавымі? Ці адлюстроўваюцца маральныя якасці ў знешнім абліччы гэтых людзей?*

Заданне 3. Мы ўбачылі, як прыгожае ўвасабляецца ў жывапісе. Звернемся да яго славеснага вобразу, што ярка прадстаўлены ў лісце Васіля Аляксандравіча Сухамлінскага да сына. (На кожнай парце знаходзіцца тэкст пісьма. Вучні самастойна знаёмяцца з ім; Дадатак 2).

Гутарка:

– Каму адрасавана гэты ліст?

– Ці толькі сыну? Падумайце. Прывядзіце прыклады з тэксту, якія пацвярджаюць вашы думкі.

– Што вызначае В.А. Сухамлінскі як найвышэйшую чалавечую каштоўнасць?

– Да чаго заклікае нас аўтар?

*Слова настаўніка.* Так, знешняя прыгажосць звяртае на сябе ўвагу ў першую чаргу, бо, як кажа прымаўка, па адзенні сустракаюць. Асабліва ў наш час, калі актыўна прапагандуюцца культ знешняй прыгажосці і вечнай маладосці. Аднак шматвяковы досвед пацвярджае мудрыя і справядлівыя словы В. А. Сухамлінскага: «Духоўная пустата робіць безаблічнай знешнасць чалавека».

**3. Падвядзення вынікаў занятка. Рэфлексія.**

Методыка незакончаных выказванняў (адказваюць вучні пісьмова, хто жадае зачытвае)

Дабрыня – гэта ______________________________

Чалавечнасць – гэта __________________________

Выхаванасць – гэта ___________________________

Добразычлівасць – гэта _______________________

Прыстойнасць – гэта __________________________

Грубасць – гэта ______________________________

Хамства – гэта ______________________________

Хлусня – гэта _______________________________

Здрада – гэта _______________________________

Прыгажосць – гэта ___________________________

– У завяршэнні нашай гутаркі хачу прапанаваць вашай увазе мой любімы верш М. Забалоцкага «Непрыгожая дзяўчынка» (Дадатак 3).

Дадатак 1

Стихотворение С. Орлова

Вот человек — он искалечен,
В рубцах лицо. Но ты гляди
И взгляд испуганно при встрече
С его лица не отводи.
Он шел к победе, задыхаясь,
Не думал о себе в пути,
Чтобы она была такая:
Взглянуть — и глаз не отвести!

Дадатак 2

Пісьмо Васіля Аляксандравіча Сухамлінскага да сына.

*С того времени, как человек стал человеком, с того мгновения, когда он засмотрелся на красоту вечерней зари, он стал всматриваться в самого себя. Красота – это глубоко человеческое. Это радость нашей жизни. Человек стал Человеком потому, что увидел глубину лазурного неба, мерцание звёзд, розовый разлив вечерней зари, багровый закат пред ветреным днём, трепетание марева над горизонтом, бесконечную даль степей, синие тени в сугробах мартовского снега, журавлиную стаю в голубом небе, отражение солнца в мириадах капель утренней росы, серые нити дождя в пасмурный осенний день, фиолетовое облачко на сиреневом кусте, нежный стебелёк и голубой колокольчик подснежника – увидел и, изумлённый, пошёл по земле, создавая новую красоту. Остановись и ты в изумлении перед красотой – и в твоём сердце расцветёт благородство.*

*Во внешней человеческой красоте воплощены наши представления об идеале прекрасного. Внешняя красота – это не только антропологическое совершенство всех элементов тела, не только здоровье. Это внутренняя одухотворённость – богатый мир мыслей и чувств, нравственного достоинства, уважения к людям и к себе.*

*Единство внутренней и внешней красоты – это эстетическое выражение нравственного достоинства человека. Ярче всего красота человека проявляется тогда, когда он занят любимой деятельностью, которая по своему характеру подчёркивает в нём что-то хорошее, свойственное его личности.*

*Духовная пустота делает безликой внешность человека. Ничто так не обезображивает, как угодничество: человек становится не самим собой, он как бы стремится вылезть из собственной шкуры.*

*Идеал человеческой красоты – это вместе с тем и идеал нравственности. Единство физического, нравственного, эстетического совершенства – это и есть та гармония, о которой так много говорится.*

*Ты – творец собственной духовной красоты. От тебя же зависит красота людей, живущих с тобой рядом.*

Дадатак 3

Стихотворение Н. Заболоцкого «Некрасивая девочка»

Среди других играющих детей
Она напоминает лягушонка.
Заправлена в трусы худая рубашонка,
Колечки рыжеватые кудрей
Рассыпаны, рот длинен, зубки кривы,
Черты лица остры и некрасивы.
Двум мальчуганам, сверстникам ее,
Отцы купили по велосипеду.
Сегодня мальчики, не торопясь к обеду,
Гоняют по двору, забывши про нее,

Она ж за ними бегает по следу.
Чужая радость так же, как своя,
Томит ее и вон из сердца рвется,
И девочка ликует и смеется,
Охваченная счастьем бытия.
Ни тени зависти, ни умысла худого
Еще не знает это существо.
Ей все на свете так безмерно ново,
Так живо все, что для иных мертво!
И не хочу я думать, наблюдая,
Что будет день, когда она, рыдая,
Увидит с ужасом, что посреди подруг
Она всего лишь бедная дурнушка!
Мне верить хочется, что сердце не игрушка,
Сломать его едва ли можно вдруг!
Мне верить хочется, что чистый этот пламень,
Который в глубине ее горит,
Всю боль свою один переболит
И перетопит самый тяжкий камень!
И пусть черты ее нехороши,
И нечем ей прельстить воображенье, –
Младенческая грация души
Уже сквозит в любом ее движенье.
А если это так, то что есть красота
И почему ее обожествляют люди?
Сосуд она, в котором пустота,
Или огонь, мерцающий в сосуде?